імя Максіма Танка

# ытанні гісторыі, метадалогіі і методыкі выкладання

Зборнік навуковых артыкулаў
Выпуск першы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1906г. СПб., 1907. С. 102; Военно-конская перепись 1912 года. Петроград, 1914. С. 428-433.

5.Военно-конские переписи: 1888 г. С. 200-207; 1912 г. С. 428-433.

6.Падлічана па выніках ваенна-конскіх перапісаў.

7.*Шабуня К.И.* Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905-1907 гг. Мн., 1962.

8.Опыт описания Могилевской губернии. Могилев, 1884. Кн. 2.

9.Статистический обзор могилевской губернии на 1914 год. Могилев, 1915.

10.НА РБ. Ф.2001, воп.1, спр. 876.

11.Памятная книжка Гродненской губернии на 1893 год. Гродно, 1892. Отд. IV.

12.Памятная книжка Минской губернии на 1899 год. Мн., 1898.

13.Вся Россия... СПб., 1900. Т. 2. Отд. V.

14.Обзор Гродненской губернии за 1912 год. Гродно, 1913.

15.Труды местных комитетов о нуждах сельскохозяйственной промышленности. XI. Гродненская губерния. СПб., 1903.

16.Сельскохозяйственные и статистические сведения по материалам, полученным от хозяев. Вып. XI. СПб., 1903.

17.Экономика Белоруссии в эпоху империализма. Мн., 1963.

18.Памятная книжка Виленской губернии на 1895 год. Вильно, 1894. Ч.2.

19.Памятная книжка Виленской губернии на 1913 год. Вильна, 1913.Ч.2.

**У.Пуцік**

## Расійская Дзяржаўная дума другога склікання ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі

Адначасова з роспускам першай Дзяржаўнай думы адбыліся значныя перамены і ва ўрадавых колах. Мікалай II вырашыў змяніць на пасадзе старшыні ўрада паволенага І.Л. Гарамыкіна на больш энергічнага і напорыстага П.А. Сталыпіна. С.Я. Крыжаноўскі ў сваіх успамінах "Заметки русского консерватора" адзначаў, што "важнай якасцю Пятра Аркадз'евіча было ўменне абыходзіцца з народным прадстаўніцтвам... Сталыпін прынёс з сабою вопыт і веды псіхалогіі грамадскіх сходаў, якога не было ў той час у іншых міністраў. Ён любіў бурныя спрэчкі і любіў Думу як рысталішча для красамоўства, дзе ён адчуваў сябе дужым, і як арэну для ўплыву на грамадства. У гэтым была галоўная яго сіла, і ў гэтым сэнсе ён быў



безумоўным і пэўным сябрам абноўленага ладу" [1, с.107].

У цэлым урад быў зменены на адну трэць. Палітыка ж новага ўрада ўвогуле, і аграрная яе частка непасрэдна, не прэцярпелі значных перамен, яна стала больш ажыццяўлёнай, энергічнай. Аграрная рэформа 1906 года, якую часта звязваюць толькі з імем П.А. Сталыпіна, была паслядоўным працягам рэформ, якія пачаліся праводзіцца ўрадам у пачатку 1905 года.

6 мая 1905 года выдаецца ўказ "Аб усталяванні камітэта па зямельных справах і аб пераўтварэнні Міністэрства землеўладання і Дзяржаўных маёмасцяў у Галоўнае ўпраўленне Землеўпарадкавання і Земляробства". У кампетэнцыю Камітэта ўваходзіла агульнае кіраўніцтва справамі зямельнага ўпарадкавання і перасяленнем, зямельнымі крыдытамі, справаздачай зямельных банкаў [2, с. 55].

4 лістапада 1905 года быў падпісаны "Высачайшы маніфест аб палепшэнні дабрабыту і аблегчанні становішча сялянскага насельніцтва", які паменьшыў выкупныя плацяжы з усіх катэгорый сялян з першага студзеня 1906 года на палову, а з першага студзеня 1907 г. зусім іх адмяніў [2, с. 172]. Адначасова прымаецца указ "Аб аблягчэнні задачы Сялянскага Пазямельнага банка па садзейнічанню да пашырэння плошчы землеўладання малазямельных сялян". Згодна ўказа ўводзілася крэдытаванне сялян з дазволу Міністэрства фінансаў і пагашэнне запазычанасці сялян за кошт выкупных платяжоў, якія паступаюць у банк [2, с. 176].

4 марта 1906 года выдаецца ўказ "Аб усталяванні: а) Камітэта па землеўладкаванні і Земляробстве і б) губернскіх уездных землеўладкавальных камісій і аб ліквідаванні Камітэта па зямельных справах". Галоўнай мэтай гэтага ўказа значылася дапамога сялянскаму банку ў выкананні задач па аблегчанні пакупкі зямлі сялянамі і ліквідаванні недахопаў тагачаснага землеўладання і землекарыстання [2, с.266].

З прыходам да ўлады Сталыпіна ўзмацніліся рэакцыйныя тэндэнцыі ў палітычным жыцці. 19 жніўня 1906 года ў адпаведнасці з артыкулам 87 Асноўных законаў быў прыняты ўказ аб ваенна-палявых судах. Да разгляду гэтых судоў адносіліся справы аб відавочным злачынстве, калі не было патрэбы ў яго расследаванні. Судаводства праводзілася ў межах 48 гадзін, прыгавор выконваўся ў 24 гадзіны [2, с.400]. Сваім вастрыём ён быў напраўлены супраць рэвалюцыі, яе жорсткасці, анархіі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

Аднак старшыня ўрада разумеў і моц сялянскага руху, і складанае становішча ў дзяржаве, якую ўзначальваў яго ўрад. Сталыпін ведаў і стан краіны і прароцтвы, якія вырваліся ў Дз.С.Сіпягіна пасля аб'езду ім Паволжжа: "Мы стаім на вулкане". Агонь сацыяльнай зайздрасці, які хаваўся ў нетрах Расіі, у яе полу-адукаваных плынях, прарваўся тут (маецца на ўвазе рэвалюцыйнае становішча ў 1905-1907 гг.) наверх, пагражаючы зліквідаваць сам будынак дзяржаўнасці. [1, с. 119].

Разумеючы складанасць абставін, Сталыпін робіць стаўку не толькі на рэпрэсіі, але і на рэформы, ён іх працягвае і спрабуе рабіць гэта больш аператыўна і радыкальна. 24 жніўня ўрад апублікаваў дэкларацыю, дзе імкнуўся абвесціць намеры на правядзенне сур'ёзных сацыяльных рэформ, значна радыкалізаваць іх, асабіста аграрныя.

Ужо 27 жніўня 1906 года быў прыняты указ "Аб прызначэнні казённых зямель да продажы дзеля пашырэння сялянскага землекарыстання", які значна пашыраў, узбуджаў аграрную рэформу. Праз тры тыдні -19 верасня 1906 года - зноў на карысць аграрнай справы быў выдадзены указ "Аб перадачы Кабінецкіх зямель у Алтайскай акрузе ў распараджэнне Галоўнага Упраулення Землеўладкавання і Земляробства для ўсталявання перасяленчых участкаў", што павінна было абвесціць перасяленне сялян з густанаселеных раёнаў, указам акрэсліваліся значныя ільготы [2, с. 411].

Зноў праз тры тыдні - 5 кастрычніка 1906 г. - урад прымае новы ўказ "Аб адмене некаторых абмежаванняў у правах сялянскіх жыхароў і асоб былых падатных станаў", які абвесціў адзіныя правы для ўсіх падатных у адносінах да дзяржаўнай службы, ліквідаваліся кругавая парука, падушны падатак, абмежаванні свабоды перамяшчэння сялян і г.д. [2, с.413].

Праз месяц - 9 лістапада 1906 г. - з'яўляецца новы ўрадавы ўказ, знакаміты Сталыпінскі, які ўвайшоў у гісторыю як "Сталыпінская аграрная рэформа". Называўся ён "Аб дапаўненні некаторых пастанаўленняў дзеючага закона, якія тычацца сялянскага землеўладання і землекарыстання". І гэта была не апошняя ўрадавая пастанова на карысць сялян у 1906 г. Праз тыдзень -15 лютага прыняты наступны ўказ "Аб выдачы Сялянскім Пазямельным Банкам ссуд пад залог надзельных зямель". Гэты ўказ адмяняў забарону аддаваць у залог прыватным асобам і прыватным грамадствам надельныя землі. Банк выдаваў мэтавыя ссуды і г.д. [2, с. 466] і гэта былі толькі першыя крокі.

Новая выбарчая кампанія ў Думу выклікала шырокі грамадскі рух і зноў



разгарнулася барацьба розных сацыяльных і палітычных сіл па пытанні аб адносінах да яе, аб аграрнай праблеме і г.д. Указам ад 8 ліпеня 1906 г. адначасова з роспускам першай Дзяржаўнай думы быў вызначаны тэрмін склікання другой Думы - 20 лютага 1907 г.

Выбары, як і ў першую Думу, меліся праводзіцца на аснове закона ад 11 снежня 1905 г., якім вялікая частка насельніцтва краіны пазбаўлялася выбарчых правоў. Выбары былі цэнзавыя, шматступенныя. У памешчыцкай курыі адзін землеўладальнік з'яўляўся прадстаўніком ад 2 тыс. чалавек, у гарадской - ад 4 тыс., сялянскай - 30 тыс., рабочай - 90 тыс. Даволі шырокае прадстаўніцтва сялян было звязана з тым, што царскі ўрад разлічваў на манархізм гэтай часткі насельніцтва. Аднак вопыт першай Думы, і менавіта патрабаванні сялянскіх дэпутатаў па аграрным пытанні, дапамаглі нейтралізаваць такія разлікі, і ва ўмовах рэвалюцыі змяняць выбарчы закон царызм не адважыўся.

На Беларусі значна актывізавалася дзейнасць акцябрыстаў у параўнанні з выбарчай кампаніяй у першую Дзяржаўную думу. Больш цесным стала іх супрацоўніцтва з чарнасоценцамі. Рускія акцябрысцка-чарнасоценныя перадвыбарныя камітэты заклікалі да яднання і сумесных дзеянняў усё рускае насельніцтва краю. Змагаючыся з рэвалюцыяй, яны разам з тым імкнуліся ліквідаваць эканамічнае панаванне і палітычны ўплыў у краі польскіх землеўладальнікаў і яўрэйскай буржуазіі.

Польскія памешчыкі сумесна з ксяндзамі мелі на мэце аб'яднаць пад сваім уплывам усё каталіцкае насельніцтва заходніх губерняў, заклікаючы да адзінства на нацыянальнай і рэлігійнай аснове. Зноў актыўную дзейнасць у гэтым кірунку праводзіў, як і пры выбарах у першую Думу, лідэр польска-літоўскіх клерыкалаў Віленскі епіскап барон Э.Ю.Роп.

Вялікім поспехам сярод гарадской яўрэйскай буржуазіі і буржуазнай інтэлігенцыі карысталіся кадэты і пракадэцкі "Саюз дзеля дасягнення раўнапраўя яўрэяў у Расіі". Як і ў першую выбарчую кампанію, у гарадах яўрэі і "дасягненцы" атрымалі поўную перамогу [3]. Актыўную дзейнасць сярод працоўных разгарнулі таксама сацыял-дэмакраты і партыі народніцкага тыпу: эсэры, энесы, БСГ ды інш. Яны мелі значны ўплыў на сялянства. Нягледзячы на ціск з боку адміністрацыі і паліцыі, ад сялян у выбаршчыкі часта праходзілі трудавікі, сацыял-дэмакраты, эсэры, члены БСГ [4]. Аднак у выніку актыўнай дапамогі паліцыі і царквы перамогу ў выбарчай кампаніі мелі крайне правыя і акцябрысты.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

На тэрыторыі беларускіх губерняў як і год таму пачалі ўзнікаць грамадскія выбарчыя камітэты. Польскія крупныя памешчыкі асноўную сваю ўвагу ўдзялялі куры землеўладальнікаў, дзе іх прадстаўніцтва было значным. Улады, рускія памешчыкі рабілі стаўку на дробных землеўладальнікаў, у гарадскіх курыях нацыянальныя камітэты спрабавалі знайсці паміж сабою пагадненні, заключыць дамовы аб блоках.

Ад Віленскай губерні, дзе заўжды былі моцнымі пазіцыі каталіцкага касцёлу, ў Дзяржаўнуго думу былі абраны: С.А.Ваньковіч, 1861 г.н., памешчык, адукацыю атрымаў у віленскім вучылішчы і Кранштацкім вучылішчы марскіх інжынераў, віцэ-прэзідэнт Віленскага сельскагаспадарчага таварыства, вольны палітык; М.А. Вянслаўскі, 1841 г.н., гарадскі галава Вільні, скончыў Віленскую гімназію і юрыдычны факультэт Санкт-Пецярбурскага універсітэта, акцябрыст; С.В. Пілейка, 1868 г.н., селянін Вішнеўскай гміны Ашмянскага павета, служыў валасным суддзёй, беспартыйны; Л.С. Путкамер, 1859 г.н., інжынер на чыгунцы, ўдзельнічаў у пабудове чыгунак: Уральскай, Бакінскай, Палескай, апякун евангельска-рэфармісцкага прыхода ў Вільні, належыў да народных дэмакратаў; Л.К. Радзевіч, 1872 г.н., ксёндз, скончыў Віленскую рымска-каталіцкую духоўную семінарыю, належыў да народных дэмакратаў; А.С. Хамінскі, 1859 г.н., памешчык, скончыў Валагодскую гімназію і юрыдычны факультэт Варшаўскага універсітэта, вольны палітык; М.Г. Хялхоўскі, 1857 г.н., памешчык, скончыў Віленскую гімназію і юрыдычны факультэт Варшаўскага універсітэта, належыў да народных дэмакратаў.

Дэпутатамі ад Віцебскай губерні ў II Дзяржаўную думу былі абраны: М.М.Беніслаўскі, 1857 г.н., скончыў Рыжскі політэхнічны інстытут, генеральны дацкі консул у Пецярбургу, народавец; А.У.Бурмейстар, 1874 г.н., памешчык, вучыўся ў Дзвінскім рэальным вучылішчы, памяркоўны; Я.П.Быкаў, 1871 г.н., селянін в. Плінчына Даміні каўскай воласці, скончыў народнае вучылішча, служыў па 3 гады сельскім старастам, валасным старшынёй і земскім галосным, памяркоўны; Г.К.Дымша, 1866 г.н., скончыў медыцынскі факультэт Варшаўскага універсітэта са званнем лекара,належыў да народных дэмакратаў; Э.А.Казрыч, 1871 г.н., прапаршчык запасу, скончыў курс Рыжскага політэхнічнага інстытута, памяркоўны; Ф.І.Петрачэнка, 1875 г.н., селянін в. Дуброўніцы Уладзімірскай воласці, скончыў народнае вучылішча, удзельнік руска-японскай вайны, памяркоўны.

З Гродзенскай губерні ў Думу прайшлі: М.Ф.Дземідзюк, 1874 г.н.,



селянін, скончыў пачатковую сельскую школу, прагрэсіст; П.П.Лапацін, 1863 г.н., памешчык, атрымаў сярэднюю адукацыю, конназаводчык-спартсмен, акцябрыст; Я.І.Ляпёшка, 1867 г.н., селянін, меў ніжэйшую адукацыю, належыў да памяркоўных; З.Л.Макарэвіч, 1875 г.н., селянін, меў ніжэйшаю адукацыю,належыў да прагрэсістаў; А.М.Санцэвіч, 1881 г.н., мяшчанін, атрымаў сярэднюю адукацыю, служыў памочнікам начальніка на чыгунцы, ў час руска-японской вайны служыў на ваенным тэлеграфе, прагрэсіст; С.Е.Сядляр, 1860 г.н., селянін, скончыў пачатковую школу, належыў да памяркоўных; С.С.Ячыноўскі, 1858 г.н., прысяжны паверены, скончыў юрыдычны факультэт Варшаўскага універсітэта, прагрэсіст.

Ад Магілёўскай губерні ў II Дзяржаўную думу былі абраны: М.І.Гашкевіч, 1862 г.н., святар с. Ануфрыева Чэрыкаўскага павета, скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю, да прыняцця святарства працаваў выкладчыкам Мсціслаўскага духоўнага вучылішча, прагрэсіст; Л.Е.Емяльянаў, 1872 г.н., селянін с. Надзейкавічы Надзейкавіцкай воласці Клімавіцкага павета, валасны старшыня, скончыў курсы ў Мсціслаўскім духоўным вучылішчы, беспартыйны; П.А.Казакоў, 1875 г.н., селянін в. Усушкі Даўгамохскай воласці Быхаўскага павета, скончыў народнае вучылішча, ўдзельнік руска-японскай войны, быў паранены пад Мукдэнам, меў адзнакі ордэна св. Георгія, беспартыйны; Л.Ф.Лубенскі, 1861 г.н., скончыў тэхналагічны інстытут у Грацы (Аўстрыя), член саветаў магілёўскага і мінскага сельскагаспадарчых таварystваў, правы; І.П.Сазановіч, 1855 г.н., скончыў прыходскае вучылішча, Магілёўскую гімназію і філасофскі факультэт Санкт-Пецярбургскага універсітэта, доктар літаратуры, прафесар Варшаўскага універсітэта па кафедры гісторыі заходніх літаратур, належыў да памяркоўных; С.А.Шыдлоўскі, 1865 г.н., прадвадзіцель дваранства Сенненскага павета, вучыўся ў Пскоўскім кадэцкім корпусе, затым скончыў Канстанцінаўскае артылерыйскае вучылішча, быў 6 гадоў на ваеннай службе, 6 гадоў - земскім начальнікам у Самарскай губерні, акцябрыст; Д.К.Шчарбанюк, 1875 г.н., селянін с. Палуж Калужскай воласці Чэрыкаўскага павета, скончыў народнае вучылішча, належыў да прагрэсістаў.

Мінскую губерню ў Дзяржаўнай думе другога склікання прадстаўлялі: А.А.Гаўрыльчык, 1880 г.н., селянін в. Лошніцы Барысаўскага павета, скончыў народнае вучылішча, член "Рускага ўскраіннага саюза", належыў да акцябрыстаў; П.Ф.Грудзінскі, 1878 г.н., мешчанін, меў пачатковую адукацыю, акцябрыст; І.С.Івашчанка, 1851 г.н., тайны саветнік, член савета Дзяржаўнага



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

банка, старшыня рэвізійнай камісіі г. Пецярбурга, атрымаў вышэйшую адукацыю, выдатны фінансіст, належыў да акцябрыстаў; А.А.Краскоўскі, 1871 г.н., селянін в. Ляхава Наваградскага павета, адукацыю атрымаў дома, член “Рускага ўскраіннага саюза”, прагрэсіст; Р.А.Лашкароў, нарадзіўся ў 1863 г.н., буйны землеўладальнік Бабруйскага павета, адстаўны палкоўнік лейбгвардыі Праабражэнскага палка, акцябрыст; В.М.Мельнік, 1867 г.н., селянін м. Лоеў Рэчыцкага павета, атрымаў пачатковую адукацыю, член “Рускага ўскраіннага саюза”, належыў да акцябрыстаў; Д.Я.Раменчык, 1863 г.н., селянін м. Любань Бабруйскага павета, валасны старшыня, член “Рускага ўскраіннага саюза”, беспартыйны; І.А.Шыманскі, 1872 г.н., селянін в. Струг Старасельскай воласці Мінскага павета, скончыў народнае вучылішча, член “Рускага ўскраіннага саюза”, В.А.Якубовіч, 1869 г.н., святар Петрыкаўскай царквы (у Мазырскім павеце), скончыў духоўную семінарыю, член “Рускага ўскраіннага саюза” належыў да акцябрыстаў [5, с. 16-28, 78-84, 169-184].

20 лютага 1907 г. пачала працу Дзяржаўная дума другога склікання. Першае паседжанне апоўдні адкрыў вызначаны для гэтага Найвышэйшым указам член Дзяржаўнага савета, правадзейны дарадца І.Я.Голубеў.

Па выніках выбараў другая Дума стала больш радыкальнай у параўнанні з першай: з 518 членаў другой Думы фракцыю правых складалі ўсяго 54 чалавекі. Кадэты страцілі амаль палову месцаў (са 179 мелі 98), затое значна ўзмацніліся левыя фракцыі: трудавікі мелі 104 месцы. Ва ўмовах спаду рэвалюцыі бальшавікі прынялі ўдзел у выбарах і працы Дзяржаўнай думы другога склікання. Сацыял-дэмакратычную фракцыю складалі 66 членаў.

Нягледзячы на колькаснае змяншэнне, кадэты захавалі кіраўніцтва і ў гэтай Думе. Іх падтрымлівалі аўтанамісты (76 членаў), а нярэдка і дробнабуржуазныя фракцыі (народныя сацыялісты, эсэры і трудавікі) [6, с. 265].

Старшынёй Дзяржаўнай думы другога склікання быў абраны кадэт Ф.Л.Галавін, які пры балатыроўцы атрымаў 356 галасоў “за” і 102 – “супраць”. Склад прэзідыума другой Думы канчаткова сфарміраваўся 23-га і 24 лютага: таварышамі старшыні былі абраны М.М.Пазнянскі, М.Я.Бярэзін, сакратаром – М.В.Чаўнакоў, таварышамі сакратара – В.П.Успенскі, В.Л.Харламаў, Л.В.Карташоў, С.М.Салтыкоў, і С.Н.Максудаў. На трэцім паседжанні былі створаны аддзелы Дзяржаўнай думы.

Прайграўшы выбары, кадэты распачалі палітычную барацьбу ў самой Думе за ўтварэнне кааліцыйнай большасці. Ужо 21 лютага адзін з лідэраў



партыі П.М. Мілюкоў у сваім артыкуле “Першыя ўражанні”, прысвечаным працы Дзяржаўнай думы, выклаў пажаданую тактыку новага парламента: “Не штурм, а правільная асада” [7, с. 56].

Гэта азначала не выстаўленне безнадзейных патрабаванняў, а “...<<сістэматычную заваёву пазіцый моцнага праціўніка>>. Дадзены лозунг стаў агульным, і абодва бакі рыхтаваліся да сустрэчы, улічваючы гэта. Спяшацца няма чаго, барацьба будзе сур’ёзная і доўгая, а пакуль, сустрэўшыся на першы раз, праціўнікі мераюць адзін аднаго позіркамі, перш чым памерыцца сіламі” [7, с. 57].

Дзяржаўная дума другога склікання, як і першага, не збіралася супрацоўнічаць з урадам. Кадэты былі галоўнай фракцыяй і не жадалі роспуску Думы, бо менавіта праз яе можна было закласці, развіць і зберагчы для Расіі традыцыі еўрапейскага парламентарызму. Аднак узнікшае правае крыло і ўзмоцненае левае прымусілі кадэцкую фракцыю сфарміраваць кааліцыйную большасць дзеля крытыкі ўрада і адмовы ад супрацоўніцтва з ім. Так у Думе была створана левая большасць.

Чацвёртае паседжанне Дзяржаўнай думы другога склікання, назначанае на 2 сакавіка, праходзіла ў Круглай зале Таўрыцкага палаца. Пачалося яно са спазненнем, у 11 гадзін, з-за інцыдэнту, што адбыўся ў 7 гадзін, калі ў вялікай думскай зале абвалілася столь. Паседжанне мела выключна эмацыянальны характар: было вырашана распачаць расследаванне прычын падзення столі. Чацвёртае паседжанне Думы адкрылася 6 сакавіка ў зале Дваранскага сходу.

На гэтым паседжанні старшыня Савета міністраў П.А.Сталыпін зачытаў дэкларацыю ўрада. В.У.Леантовіч, гісторык, які шмат часу прысвяціў даследаванню расійскага лібералізму, лічыў, што “ліберальная праграма, выкладзеная Сталыпіным у вялікай прамове ў Думе 6 сакавіка 1907 г., уяўляе сабою адзін з самых рашучых наступаў лібералізму ва ўсёй расійскай гісторыі. Сталыпін прадставіў шырокую і цудоўна пабудаваную праграму ліберальных рэформаў... Гэты план заставаўся падмуркам палітыкі ўрада не толькі да смерці Сталыпіна, але і пры яго пераемніку Какоўцавым, і нават можна сказаць... што гэты план азначыў усю ўрадніцкую праграму да рэвалюцыі 1917 г.” [8, с. 513].

Аднак дэпутаты паспрабавалі не заўважыць прапаноў П.А. Сталыпіна і адказалі маўчаннем, прытрымліваючыся тактыкі “берагчы Думу” – пазбягаць якіх-небудзь выказванняў супраць урада, а затым галасавалі за пераход да павесткі дня без абмеркавання. Але ўрад не мог не разумець сапраўднага



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

значэння такога маўчання, тым больш што левая прэса паспяшыла паведаміць пра гэта грамадскасці. Так, напрыклад, П.М.Малюкоў у газеце “Речь” пісаў: ”Дума вас знаць не жадае” [8, с. 518].

Гэты дзень стаў гістарычным у працы другой Думы. Для ўсяго расійскага грамадства быў зразумелы і прадказальны наступны ход падзей на палітычным алімпе: чаго чакаць ад урада, а чаго – ад Думы, у якой панавала кадэцкая партыя.

7 сакавіка – пачатак заканадаўчай працы ў Думе. На гэтым паседжанні быў аб’яўлены спіс законапраектаў, унесеных у Думу на разгляд міністрамі і галоўнаўпраўляючымі. 12 і 13 сакавіка дэпутаты абмяркоўвалі законапраект аб адмене ваенна-палявых судоў, і, нарэшце, 19 сакавіка Дзяржаўная дума другога склікання прыступіла да абмеркавання аграрнага пытання.

Гэтае пытанне, як і ў працы першай Думы, адразу стала галоўнай тэмай спрэчак дэпутатаў. Улічваючы важнасць і вялікую колькасць жадаючых выступіць у абмеркаванні аграрнага пытання, дэпутаты вырашылі прысвяціць яму два дні на тыдзень – панядзелак і чацвер. Беларускія дэпутаты ў абмеркаванні зямельнай рэформы прынялі самы актыўны ўдзел. Неабходна адзначыць, што дэпутаты ад 5 губерняў Паўночна-Заходняга края: Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай – яшчэ раней, да абмеркавання аграрнага пытання, актыўна ўключыліся ў работу Думы. Яны ўвайшлі ў склад 13 з 23 думскіх камісій.

У аграрнай камісіі працавала 6 дэпутатаў ад беларускіх губерняў. У спрэчках па пытанні выступалі ў асноўным дэпутаты ад сялян. Дэпутаты-памешчыкі каталіцкага веравызнання, аб’яднаныя ў так званае “кола польскіх дэпутатаў Літвы і Русі”, не змянілі сваіх пазіцый з часоў работы першай Думы. Яны наважыліся прытрымлівацца і адстойваць права прыватнай уласнасці на зямлю, але ў выпадку дзяржаўнай неабходнасці пагаджаліся на адчужэнне за выкуп нават часткі прыватных земляў, аднак з вырашэннем гэтага пытання ў краі.

Добра разумеючы, што такія меркаванні не пройдуць у Думе, яны ў асноўным і не выступалі, у адрозненне ад дэпутатаў-сялян. Фактарам раздражнення для сялян з беларускіх губерняў стала выступленне дэпутата Варшаўскай губерні Р.В.Дмоўскага, які зазначыў, што, праводзячы рэформу, трэба ўлічваць асаблівасці кожнага рэгіёна Расіі. Характарызуючы літоўскія і беларускія землі, ён падкрэсліў: “ Аграрнае пытанне можа быць вырашана і асновы аграрнай рэформы павінны быць прыменены толькі пасля выдання і



ўвядзення ў выкананне законаў аб агульных грамадзянскіх свабодах – аб раўнапраўі нацыянальнасцяў і веравызнанняў, нарэшце, пасля ўсталявання ва ўсёй імперыі шырокага мясцовага самакіравання...” [9, т.1, с. 747].

Абагульняючы свае погляды на вырашэнне зямельнага пытання ў беларускіх губернях, Дмоўскі робіць вывад: “... гэтае пытанне ў цяперашні час нават абмяркоўвацца ў Дзяржаўнай думе не можа. Законапраекты для гэтых абласцей павінны быць падрыхтаваны ў мясцовых установах пасля таго, як яны будуць усталяваны (дэпутат меў на ўвазе выбарныя земствы ў заходніх губернях. – У.П.), тады толькі павінны паступіць у Дзяржаўную думу” [9, т.1, с. 748].

Чамусьці галоўнымі апанентамі Р.В.Дмоўскага сталі праваслаўныя сяляне з беларускіх губерняў, якія прытрымліваліся нацыяналістычных пазіцый і ў Думе далучаліся да фракцыі правых. Гэтыя дэпутаты ў сваіх выступленнях з думскай трыбуны па аграрнай праблеме спрабавалі перавесці вастрыё сваіх атак з эканамічных і сацыяльных пытанняў на нацыянальныя. Дэпутаты-сяляне Мінскай губерні А.А.Гаўрыльчык, А.А.Краскоўскі, В.М.Мельнік, І.А.Шыманскі, П.Ф.Грудзінскі на паседжаннях Думы, прысвечаных пытанням аграрнай рэформы, у сваіх выступленнях упарта праводзілі лінію аб непрыняцці вырашэння праблемы ў польскім сейме (якога не было ўвогуле), ды і Дмоўскі не раіў вырашаць беларускія пытанні ў Польшчы.

Тым не менш дэпутаты ўпарта працягвалі сваю справу, выступленні іх былі падобныя адно да аднаго і заканчваліся словамі: “Дмоўскі настойваў на тым, каб гэтае пытанне было разгледжана польскім сеймам... але праваслаўныя сяляне, усе як адзін чалавек, падымуцца на абарону дарагой сваёй бацькаўшчыны і не ўступяць ніводнай пядзі сваёй зямлі...” [10, с. 104] (з выступлення Краскоўскага ад 29. 03. 1907 г.). З інтэрвалам у два дні Думе нагадвалі пра польскі сейм, пра Дмоўскага, выказвалі пагрозы і патрабаванні падтрымкі. Гэта быў слушны тактычны ход, разлічаны на тое, каб уцягнуць у спрэчкі, заблытаць, дэзарганізаваць працу Думы.

Праз тыдзень пасля выступлення А.А. Краскоўскага рускія правыя таксама выказалі свае адносіны да Паўночна-Заходняга края і да іншародцаў увогуле. Дэпутат ад Херсонскай губерні памешчык С.І. Келяпоўскі, не саромеючыся, заявіў: “ Аграбім лепш іншародцаў, чым рускага памешчыка. Гэта будзе цалкам законна!” [10, с. 61].

У адказ на такую заяву паляцелі абвінавачванні ў амаральнасці і



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

беспрынцыпнасці, рабочая атмасфера ў зале паседжаняў стала больш напружаная. Узнікшыя ўнутрыдумскія супярэчнасці ўзмацнялі процістаянне ўраду, што скарачала час існавання самой Думы.

Другая Дума, якая ўвесь час канфліктавала з урадам, ішла да свайго непазбежнага роспуску. Апошнім, што вывела з цярплівасці Мікалая ІІ і ўрад, сталі паседжанні, якія адбыліся 17 красавіка і 7 мая.

На закрытым паседжанні 17 красавіка Міністэрства ўнутраных спраў унесла ў Думу на разгляд законапраект аб вызначэнні кантынгенту навабранцаў вясенняга прызыву. Міністр фінансаў У.М.Какоўцаў, апісваючы гэты інцыдэнт, адзначыў, што "спрэчкі адразу прынялі прадузяты і страсны характар. Застрэльшчыкамі з'яўляліся кадэцкія дэпутаты... Пасля іх сталі выказваца трудавікі, з кожным разам узвышаючы тон сваіх прамоў і абвастраючы аргументы пра цяжкасці вайсковай павіннасці, якая абядняе дзяржаву... Прадстаўнікі ўрада па чарзе прасілі слова, у самай стрыманай форме пераконваючы ў няправільнасці пачутых меркаванняў...

Чарга дайшла да каўказскага дэпутата А.Г.Зубарава, які выгукнуў у адрас Сталыпіна вядомую фразу, выказаную з уласцівым яму рэзкім акцэнтам: "Гаспадин министр, пожалуйства, пагади, не уходи, я тебя ещё ругать буду". Зубараў адразу прыдаў сваёй прамове небывалы для другой Думы тон, зняважліва выказаўся пра армію, перайшоўшы ў выступленні ледзь не на лаянку, абвінаваціў урад у яе разбэшчванні, падрыхтоўцы арміі выключна да вынішчэння мірнага насельніцтва і закончыў прамым заклікам да ўзброенага паўстання, у якім, зразумеўшы ў рэшце рэшт "гнюсную ролю ўрада, войскі сальюцца з разораным насельніцтвам і звергнуць ненавісны ўрад" [11, т. 1, с. 228].

Наступны выклік ураду і цару быў здзейснены Дзяржаўнай думай 7 мая, калі 33 правыя дэпутаты зрабілі запыт наконт чутак пра змову з мэтай замаху на жыццё імператара.

Дэпутаты левых фракцый: сацыял-дэмакраты, сацыялісты-рэвалюцыянеры, народныя сацыялісты, трудавікі – не з'явіліся на галасаванне, дэманстратыўна адсутнічала прыблізна чацвёртая частка членаў Думы [11, т.1, с. 231]. Пасля 7 мая ўсім стала зразумела: роспуск Думы – гэта пытанне некалькіх дзён. І ў хуткім часе такі прэцэдэнт быў знойдзены. 1 чэрвеня 1907 г. у Думе была зачытана пастанова аб прыцягненні да адказнасці 55 членаў Дзяржаўнай думы, што належылі да сацыял-дэмакратычнай фракцыі, па абвінавачванні ў дзеяннях, прадугледжаных 1-й



часткай 102-га артыкула "Крымінальнага кодэкса", і аб узяцці 16 з названых асоб пад варту.

Міністр юстыцыі ўказаў пры гэтым на неабходнасць найхутчэйшага вырашэння Дзяржаўнай думай пытання пра часовае, згодна з артыкуламі 20 і 21 Палажэння аб заснаванні Дзяржаўнай думы, адхіленне ад удзелу ў паседжаннях ўсіх прыцягнутых да следства 55 членаў Думы [ 12, с. 507 ].

Спасылка старшыні Дзяржаўнай думы другога склікання Ф.Л.Галавіна на параграф 96 наказу, дзе запісана, што ні адна справа, не пазначаная ў павестцы дня, па сутнасці, на гэтым жа паседжанні не разглядаецца. Прапановы Дзяржаўнай думы перадаць прадстаўленне міністра юстыцыі і пастанову пракурора на заключэнне камісіі з 22 чалавек, што адтэрміноўвала разгляд справы да панядзелка, 4 чэрвеня, выклікала пэўную рэакцыю ўрада і Мікалая ІІ. 3 чэрвеня былі аб'яўлены маніфест і ўказ аб роспуску другой Думы і прызначэнні выбараў у трэцюю Думу; адначасова быў апублікаваны тэкст новага выбарчага закону [7, с. 226].

Другая Дзяржаўная дума праіснавала 103 дні, за гэты час адбыліся 53 паседжанні.

## Літаратура і крыніцы

1.*Крыжановский С.Я.* Заметки русского консерватора //Вопросы истории. 1997. № 4.

2.Законодательные акты переходного времени. 1904-1908 гг. СПб., 1909.

3.Северо-западный голос. 1907. 13 янв; Голос провинции. 1906. 03 дек.

4.Северо-западный голос. 1906. 19 авг.; Свободное слово. 1906. 26 нояб.

5.*Биович М.М.* Члены Государственной Думы II созыва. Портреты и биографии. М., 1907.

6.*Ерошкин Н. П.* История государственных учреждений дореволюционной России.

7.*Милюков П.Н.* Вторая дума 1907 г. СПб., 1908.

8.*Леонтович В.В.* История либерализма в России. 1762-1914. М., 1995.

9.Государственная дума: Стеногр. отчеты. Созыв II. Сессия I. Т. I. С. 747.

10.*Томсинский С.Г.* Борьба классов и партий во второй Государственной думе. М., 1924.

11.*Коковцов В.Н.* Из моего прошлого: Воспоминания 1903-1919 гг.: В 2 т. М., 1992. Т. I.

12.*Шипов Д.Н.* Воспоминания. М., 1918.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ